© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025

***Лабусава Л. У.***, *настаўніца пачатковых класаў Крапівенскай сярэдняй школы Аршанскага раёна Віцебскай вобласці*

# Змяненне дзеясловаў прошлага часу

## Беларуская мова. IV клас

| **Часы дзеясловаў** | **Утварэнне дзеясловаў прошлага часу** | **Змяненне дзеясловаў прошлага часу** | **Ужыванне дзеясловаў прошлага часу** |
|---|---|---|---|
| ведаю | не ведаю | не ведаю | не ведаю |

<table>
<tr><th rowspan="2">Неазначальная форма</th><th rowspan="2">Множны лік</th><th colspan="3">Адзіночны лік</th></tr>
<tr><th>ж. р.</th><th>м. р.</th><th>н. р.</th></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>

**Заданне:** знайсці ў тэксце дзеясловы, выпісаць іх, вызначыць лік і род, абазначыць канчаткі.

Фашысцкія захопнікі стварылі на тэрыторыі Беларусі больш за 580 лагераў смерці. За час акупацыі гітлераўцы правялі не менш за 187 карных аперацый, у ходзе якіх знішчалі вёскі і пасёлкі разам з жыхарамі і спусташалі цэлыя раёны.

Фашысцкімі захопнікамі знішчылі на тэрыторыі Беларусі больш за 3 000 000 чалавек. Гітлераўцы разбурылі 209 гарадоў, спалілі не менш за 11 726 вёсак.

Вызваленая Орша ўяўляла сабой суцэльныя руіны, папялішчы і пажарышчы. Фашысцкія захопнікі разбурылі горад амаль на 80 %. У руінах ляжалі заводы, фабрыкі, медыцынскія ўстановы, чыгунка. Насельніцтва горада, у параўнанні з даваенным, зменшылася амаль у 20 разоў. У Аршанскім раёне гітлераўцы знішчылі 9 вёсак.

---

| | |
|---|---|
| Прывітанне | Добры дзень |
| Зварот | Дарагі, паважаны, ветэран, герой-пераможца, дзядуля, бабуля... |
| Паведамленне або віншаванне | Хачу расказаць...<br>Віншую Вас...<br>Жадаю Вам...<br>Хачу падзякаваць...<br>Дзякуй Вам...<br>Свята Перамогі, 9 Мая.<br>Шчасця, здароўя, доўгіх гадоў жыцця |
| Развітанне | Да пабачэння…<br>З павагай…<br>З удзячнасцю… |
| Подпіс | Твой унук, праўнук… |

**Заданне:** знайсці і выпісаць дзеясловы прошлага часу, вызначыць час, лік, абазначыць суфіксы і канчаткі.

Група 1.

Паважаны дзядуля!

Я хачу сказаць табе дзякуй за тое, што ты абараняў нашу Радзіму. Я бачыла, што ў цябе шмат медалёў і ордэнаў, значыць, ты мужна ваяваў.

Многія людзі ў час вайны страцілі сваіх родных, блізкіх, гэта вельмі цяжка. Наогул, калі ідзе вайна, гэта вельмі страшна і балюча. Я спачуваю ўсім людзям, якія выпрабавалі нягоды гэтай страшнай вайны.

Мне вельмі хацелася, каб на зямлі быў мір і ніколі не было вайны.

Група 2.

Добры дзень, невядомы салдат!

Хачу падзякаваць табе за гераізм і перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, за тое, што ты быў адважным і смелым, калі абараняў нашу Радзіму.

Я ведаю, што табе і тваім таварышам было цяжка, часам невыносна, але ўсе выстаялі і перамаглі.

Дзякуй табе, салдат, за чыстае неба над галавой. Я вырасла ў мірнай краіне. Мне вельмі хочацца, каб больш не было вайны, каб усе вакол адчувалі радасць. Я буду памятаць цябе заўсёды і, калі вырасту, буду таксама абараняць сваю Айчыну.

*Перакладзіце на беларускую мову, падкрэсліце дзеясловы прошлага часу.*

Мальчишки и девчонки шли на фронт. Их было много. Они хотели стоять в одном строю с отцами. Обыкновенные школьники отдали свою жизнь, чтобы мы могли спокойно расти, учиться и жить.

В наших сердцах всегда будет жива память о тех, кто погиб на этой суровой войне.